кармане .Стихотворения и проза. Полоцк, 1994; «Узлёт». Зборнік твораў аб'яднання юных літатаратараў. Баранавічы, 1977 ; "Крынічка" – першы зборнік паэтаў Віцебшчыны. Витебск, 1996.
15. След чорнага ветру / Чарнобыль вачыма дзяцей/. Рэдактар-складальнік В.Ц.Якавенка. Мн.: Соц.эк.саюз "Чарнобыль". 1995.
16. Страхов И.В. Психология воображения. Саратов., 1971.
17. Теплов Б.М. Психология музыкальных способностей. М., 1980. С. 7.
18. Чистяков П.П. Письма, записные книжки, воспоминания. М.: Искусство, 1973. С. 333.
19. Яковлева Е.Л. Развитие творческого потенциала школьника // Вопросы психологии, 1996, № 3.

© Г. А. Нячай, 2003

## *ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЧНАЯ ХАРАВАЯ КАПЭЛА – ПЕРШЫ ПРАФЕСІЙНЫ АКАДЭМІЧНЫ ХОР БЕЛАРУСІ*

У 1940 годзе ў Заходняй Беларусі быў створаны ансамбль песні і танца, які стаў у далейшым вядучым акадэмічным харавым калектывам Савецкага Саюза. Яго арганізатарам і мастацкім кіраўніком на працягу дваццаці пяці гадоў з'яўлялся выдатны вучоны, этнограф і музыкант Рыгор Раманавіч Шырма. Шлях Р.Шырмы да прафесійнага харавога выканаўства быў доўгі. Ён атрымаў філолага-педагагічную адукацыю і многа гадоў займаўся выкладчыцкай дзейнасцю, узначальваючы адначасова аматарскія харавыя калектывы. У розныя гады кіраваў народным хорам у Пружанах, хорам Віленскай беларускай гімназіі, а пасля – хорам Віленскага універсітэта, з'яўляўся рэгентам царкоўнага хору ў Прачысцінскім саборы горада Вільна. За семнаццаць гадоў сваёй музычнай дзейнасці Р.Р. Шырма набыў значны практычны вопыт работы з хорам, запісаў і даследаваў вялікую колькасць беларускіх народных песень і прыцягнуў да іх апрацоўкі прафесійных кампазітараў: М. Анцава, М. Гайваронскага, К. Галкоўскага, А.Грэчанінава, А. Кошыца і іншых. У 1940 годзе Шырма ўжо знакаміты даследчык вуснай народнай творчасці, аўтар шэрага артыкулаў по праблемах культуры і мастацтва Беларусі. Таму невыпадкова стварэнне новага творчага харавога калектыву ў рэспубліцы было даручана менавіта яму.

Ансамбль песні і танца быў арганізаваны восенню 1939 года ў Беластоку. Калектыў складаўся з харавой і танцавальна-інструментальнай груп. Мэтай калектыву было «ствараць і несці масам праўдзівую вакальна-харавую культуру. Дзеля гэтага трэба было навучыць хор валодаць сродкамі музычнай выразнасці, трэба было вельмі многа папрацаваць над чысцінёй інтанацыі ў паасобных партыях хору, над вымаўленнем слова, над здабываннем «каларыту» ў голасе, каб перадаць тонка і глыбока розныя адценні душэўных перажыванняў, што выяўляюцца ў песнях. Гэта патрабавала вельмі ўпартай і марудная працы» [1, с. 146].

Аснову ансамбля песні і танца першапачаткова складалі беларускія народныя песні ў апрацоўках прафесійных кампазітараў. Рэпетыцыі праводзіліся два разы ў дзень і ўжо праз два месяцы калектыў выступіў з канцэртамі ў гарадах Слоніме, Бельску, Ваўкавыску, а 25 мая – у Мінску. Усяго за першы год існавання ансамбль песні і танца даў сто семдзесят канцэртаў.

Значнай падзеяй у жыцці ансамбля сталі гастрольныя паездкі ў Маскву і іншыя гарады Расіі ў 1941 годзе. Яны далі магчымасць пазнаёміць слухачоў з беларускімі нацыянальнымі музычнымі традыцыямі і яе харавой культурай. Поспех калектыву на лепшых сцэнах сталіцы адзначалі многія перыядычныя выданні. Газета «Правда» 6 чэрвеня 1941 года падкрэслівала «свежасць, непасрэднасць і прыгажосць беларускай народнай творчасці ў выкананні ансамбля» [2]. У Маскве калектыў зрабіў запіс на Усесаюзным радыё, а затым яшчэ даў серыю канцэртаў у гарадах Калініне, Бранску, Арле. Ансамбль захаваўся і ў час Вялікай Айчыннай вайны, гастраляваў у Сібіры і Сярэдняй Азіі. Рэпертуар хору ў гэтыя гады ўзбагаціўся творамі ваеннай тэматыкі, гераічнымі і патрыятычнымі песнямі.

У 1943 годзе калектыў вяртаецца ў вызвалены Гомель, а ў 1944 годзе пераязджае на пастаяннае месца працы ў Гродна. Пачаўся перыяд абагульнення вопыту, які быў назапашаны за гады канцэртнай практыкі, паступова паглыблялася работа харавой групы.

Па-ранейшаму вялікае значэнне калектыў надаваў выкананню беларускіх народных песень. Творчыя адносіны ансамбля і яго кіраўніка да народнай песні адзначаў музыказнаўца Б.Смольскі: «Дзяржаўны ансамбль пад мастацкім кіраўніцтвам Р.Шырмы не толькі захоўвае своеасаблівасць гучання народнай песні, імправізацыйную свабоду выканання і багацце выразных адценняў, але і надае высокую мастацкую інтэрпрэтацыю песні, тым самым уздымаючы яе на ўзровень высокай прафесійнай творчасці» [3].

Творчы дыяпазон калектыву паступова пашыраўся. Рэпертуар харавой групы ансамбля ўзбагачаўся творамі рускай харавой класікі. На ўзорах гэтай музыкі калектыў удасканальваў вакальнае майстэрства, выхоўваў тонкі густ і разуменне сур'ёзнай музыкі. Харавая група ансамбля выконвала творы П. Чайкоўскага, М. Рымскага-Корсакава, С. Танеева, Ц. Кюі, А. Грэчанінава, М. Іпалітава-Іванава, В. Шабаліна і іншых.

За дзевяць гадоў работы ансамбль песні і танца шмат чаго дасягнуў. Ён паспяхова канцэртаваў па гарадах Расіі, Прыбалтыкі і Закаўказзя. Праграмы канцэртаў калектыву былі змястоўныя і разнастайныя. Аднак, нягледзячы на поспехі, у ансамбля былі і праблемы. Адна з асноўных - недастатковая колькасць спевакоў, якія складалі харавую групу. Выкананне твораў буйной формы, а таксама вакальна-сімфанічнай музыкі патрабавала большага колькаснага складу выканаўцаў. Яшчэ адным важным пытаннем быў недахоп твораў беларускага харавога рэпертуару. Калектыў выконваў народныя песні, у той час як арыгінальных твораў на беларускія тэксты было надзвычай мала.

У студзені 1949 года ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам Р.Р.Шырмы прадстаўляў музычную культуру рэспублікі на Днях беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, канцэрты ансамбля прайшлі з велізарным поспехам. Саюз кампазітараў СССР, сродкі масавай інфармацыі назвалі калектыў пад кіраўніцтвам Р.Шырмы адным з лепшых у Савецкім Саюзе «па чысціні інтанацыі, яснасці і выразнасці выканання» [4, с. 148]. Ансамбль даў дзесяць канцэртаў на радыё і зрабіў запіс пяцідзесяці двух твораў, сярод якіх сорак беларускіх народных песень і песень на словы беларускіх паэтаў. У тым жа годзе ансамбль ажыццявіў гастрольныя паездкі па Каўказу: даў23 канцэрты ў Баку, Тбілісі, Грозным, а таксама 50 канцэртаў у Літве і Калінінградскай вобласці. У прэсе адзначалася высокая выканальніцкая культура калектыву. Напрыклад, газета «Калининградская правда» ў нумары ад 7 жніўня 1949 года назвала Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танца «значнай з'явай у мастацтве беларускага народа. ...Спевакі хору валодаюць высокай

